Асіповіцкі КРАЙ

# Елизовская школа отпраздновала вековой юбилей

*Опубликовано: Анна Сабело*
*Понедельник, 10.12.2018*

## Наперад у будучыню

**8 снежня Ялізаўская сярэдняя школа сустракала вучняў у нязвычна пярэстым убранні. Вялікія кветкі з паперы, святочныя плакаты і расцяжкі, паветраныя шары — установа адзначала векавы юбілей.**

На ўрачыстае мерапрыемства завіталі выпускнікі і настаўнікі некалькіх пакаленняў, былыя вучні: прафесар, доктар біялагічных навук, дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін УА БДСГА Святаслаў Лазарэвіч, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандр Багдановіч, цяперашні дырэктар школы Ірына Бодрусева, вядомая паэтка Людміла Паўлікава-Хейдарава (на здымку) і іншыя.



Старт святкаванню дала намеснік старшыні райвыканкама Ганна Землянухіна, а Аляксандр Багдановіч зачытаў Падзячны адрас ад міністра адукацыі Ігара Карпенкі. З рук начальніка аддзела па адукацыі райвыканкама Наталлі Шаўчэнка 16 педагогаў атрымалі граматы за добрасумленную працу, а старшыня райкама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Алена Кулакоўская адзначыла лепшых членаў “пярвічкі”.

— *Для канцэртнай праграмы мы прыдумалі шмат цікавага,* — распавяла намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Вольга Юшкевіч. — *Дзеці спявалі, танчылі, разам з бацькамі паказалі сцэнку “Сямейны альбом”, прадэманстравалі фільм пра падрыхтоўку да юбілею. Выступіла і наша каманда па чырлідынгу, якая здзівіла гледачоў сваім нумарам. У канцэрце таксама прымаў удзел узорны хор Ялізаўскай дзіцячай школы мастацтваў, а напрыканцы ўсе разам заспявалі песню, прысвечаную школе. Вось так светла ў гісторыі нашай установы і пачаўся наступны век.*